Т.М. Тарасава, Мінск

# Экзістэнцыяльны тып мастацкай свядомасці ў беларускай прозе XX стагоддзя

Фенаменалагічны падыход да вывучэння літаратурнага працэсу XX ст. у якасці базавай катэгорыі вылучае мастацкую свядомасць, найглыбей выяўленую ў прыгожым пісьменстве. Мастацкая свядомасць арганічна аб'ядноўвае філасофскія, культуралагічныя і гісторыка-літаратурныя з'явы дыялектычна, а значыць, дае магчымасць не замыкацца толькі на законах літаратурнага развіцця, але ўлічваць філасофскія, эстэтычныя, рэлігійныя тэндэнцыі часу. Каб у поўнай ступені зразумець спецыфіку мастацкай свядомасці мінулага стагоддзя, варта абапірацца на працы М. Бярдзяева, А. Лосева, П. Фларэнскага, М. Мамардашвілі, А. Пяцігорскага, Л. Закса, В. Заманскай і інш. Паводле Л. Закса, “художественное сознание <...> есть идеальная система, осуществляющая и обеспечивающая художественное освоение мира во всей его специфике” [1].

Расійскія навукоўцы (В.В. Заманская, В.І. Цюпа, З.Я. Холадава, І.А. Ядошына і інш.) вылучаюць некалькі тыпаў мастацкай свядомасці: рэлігійную, экзістэнцыяльную, міфалагічную, палітызаваную/ідэалагізаваную, дыялагічную/канвергентную (тэрмін увёў В.І. Цюпа). Зразумела, “чыстых” тыпаў не існуе, можна гаварыць пра дамінантную ролю тых ці іншых тыпаў.

Вылучэнню экзістэнцыяльнай свядомасці як самастойнай парадыгмы мыслення XX ст. спрыялі тэхнічная рэвалюцыя, крызіс грамадскіх ідэалаў, фактар мяжы/парога XIX—XX стст., запатрабаванасць вялікага творчага патэнцыялу асобы, пільная ўвага да яе свядомасці. Паняцце *экзістэнцыяльная свядомасць* як адзін з тыпаў мастацкай свядомасці ўжываюць у дачыненні да светаадчування чалавека XX ст., калі ён апынуўся ў адметнай псіхалагічнай сітуацыі “разарванага Я” (“разделенного Я”). Гэта свядомасць піка цывілізацыі, канфлікт чалавека са светам, з людзьмі, з сабой, гэта дысгармонія, катастрофа, дэгераізацыя.

Экзістэнцыяльная свядомасць як тып мастацкага мыслення не можа быць строга суаднесена з канкрэтнай літаратурнай эпохай і нацыянальнай літаратурай. Можна гаварыць аб яе быційным статусе, не пазначаным пэўнымі храналагічнымі і нацыянальнымі межамі. Таму экзістэнцыяльная свядомасць і формы яе ўвасаблення ў беларускай літаратуры не ёсць дадатак да заходнееўрапейскай экзістэнцыяльнай свядомасці XX ст., а адна з фаз развіцця гэтай свядомасці з уласцівымі ёй нацыянальнымі рысамі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Даследаванне экзістэнцыяльных дамінант у эстэтыцы пісьменніка і форм іх увасаблення ў мастацкай практыцы дае магчымасць рэпрэзентаваць экзістэнцыяльную свядомасць як цэласную мастацка-светапоглядную сістэму. Багаты творчы патэнцыял беларускай прозы XX ст. дазваляе гэта рабіць, фактычна творчасць кожнага з празаікаў з улікам індывідуальных рыс асобы (псіхагенетычных асаблівасцей, сацыяльнага статусу, жыццёвага вопыту і інш.), эстэтычных густаў можа быць даследавана на прадмет рэпрэзентацыі экзістэнцыяльнай свядомасці ў мастацкім творы. Безумоўна, мастацкі свет таленавітага пісьменніка не абмяжоўваецца толькі адным тыпам свядомасці, а ўтварае кангламерат розных тыпаў — дыялагічнай, міфалагічнай, рамантычнай, рэлігійнай, экзістэнцыяльнай, палітызаванай і інш., — але дамінантным у XX ст. становіцца экзістэнцыяльны тып мастацкай свядомасці. Таленавіты творца заўсёды ўспрымае жыццё не ў адным вымярэнні; ён спрабуе спасцігнуць сутнасць быцця, чалавека як яго найвышэйшую каштоўнасць, а значыць, экзістэнцыяльная свядомасць непазбежна прысутнічае ў мастацкім свеце пісьменніка.

Экзістэнцыяльны тып мастацкай свядомасці ў беларускай прозе XX ст. прадстаўлены ў межах псіхалагічнай рэалістычнай прозы пры спалучэнні як рэалістычных, так і авангардных форм. Гэта істотна адрознівае нацыянальную літаратуру ад мастацкага вопыту заходнееўрапейскай з яе эксперыментальнай творчай ўстаноўкай (адыход ад сацыяльнай праблематыкі ў пачуццёва-эмацыянальную сферу). Для беларускага мастацтва слова спалучэнне сацыяльнага і экзістэнцыяльнага заўсёды заставалася важным.

Рэнесансавыя тэндэнцыі ў беларускай літаратуры напачатку XX ст. пэўным чынам нейтралізавалі трагізм экзістэнцыяльнай адзіноты, раздваення асобы, уласцівы заходнееўрапейскай культуры, бо нацыянальная літаратура выконвала яшчэ і асветніцкую функцыю, а будаваць яе на трагічных асновах было бесперспектыўна. Сітуацыя савецкага часу вымагала рэалістычнага адлюстравання рэчаіснасці, актыўнага героя, не выключанага з сацыяльных сувязяў; нацыянальная літаратура канчаткова не парывае з рэалізмам, экзістэнцыяльная свядомасць выспявае, афармляецца ў яго межах, таму ў дачыненні да беларускай літаратуры варта гаварыць пра псіхалагізм з моцнай экзістэнцыяльнай афарбоўкай, так званы экзістэнцыяльны псіхалагізм, які на працягу XX ст. аформіўся ў цэласную эстэтычную сістэму ў межах рэалізму.

Экзістэнцыяльнае светаўспрыманне як універсальная субстанцыя філасофскага і мастацкага мыслення XX ст. скіравана на тое, каб “…не упускать

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

оттенков, мелких фактов, даже если кажется, что они несущественны, и, главное, привести их в систему. Описывать, как я вижу этот стол, улицу, людей, мой кисет, потому что ЭТО-ТО и изменилось. Надо точно определить масштаб и характер этой перемены” [3, с. 7]. Менавіта ў гэтым заключаецца прынцыповае адрозненне экзістэнцыяльнага падыходу да вывучэння свету ад рэалістычнага, для якога галоўнае — убачыць і зафіксаваць істотнае. Расійскі даследчык В. Заманская адзначае: “Цель экзистенциального сознания — правда: неизбирательная, вне иерархических систем, воспринятая на эмпирическом уровне, без изначальных этических концепций и критериев; правда жестокая, обнаженная, хлесткая” [2, с. 31].

Аналіз творчасці М. Гарэцкага сведчыць, што пісьменнік арганічна спалучыў еўрапейскую мадэль увасаблення экзістэнцыяльнай свядомасці з рускім псіхалагізмам і тым самым надаў нацыянальнай прозе еўрапейскае аблічча. М. Гарэцкі — пісьменнік надзвычай глыбокі ў пошуках сэнсу алагічна-загадкавага, таямніча-няўлоўнага быцця. Пісьменнік умеў працаваць на межах, на балансаванні змен у характарах, бачыць праблему ў розных ракурсах. Для М. Гарэцкага характэрны сузіральны тып чалавека “з разарванай свядомасцю”. Пагранічныя сітуацыі: жыццё і смерць, матэрыя жывая і нежывая, сон і рэальнасць, мараль і амаральнасць — набывалі ў творчасці мастака слова экзістэнцыяльны характар. М. Гарэцкі адзін з першых у беларускай прозе фарміруе выразна экзістэнцыяльны погляд на чалавека і свет, выпрацоўвае арыгінальныя прынцыпы паэтыкі экзістэнцыяльнага тыпу (экстрэмальная сітуацыя, мяжа жыццё—смерць, “плынь свядомасці”, снабачанні), здольныя найбольш адэкватна адлюстраваць алагічны свет і знявечаную свядомасць чалавека XX ст.

Творчая спадчына Якуба Коласа цікавая сваім анталагічным кампанентам як самастойным і самакаштоўным. Светапоглядная мастацкая сітуацыя “страчанага прытулку” і пошук “роднага кута”, а значыць, дому/Айчыны ёсць важны аспект у прозе беларускага класіка. Канцэпт дому абумовіў пэўную мадэль будовы дому-душы, які служыў падмуркам сям'і, а сямейны дом успрымаўся Коласам як частка дому дзяржаўнага. Для пісьменніка было прынцыпова важным мастацкае асэнсаванне канцэпту дом як духоўнай прасторы чалавека, якая вызначала гісторыка-культурную, сацыяльную сферу чалавечага быцця, закранала глыбінныя асновы арганізацыі асобы.

Колас-празаік умеў увасабляць унутраны свет чалавека праз карціны свету знешняга, а значыць, экзістэнцыяльная свядомасць выяўлялася

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

пісьменнікам найперш праз рэчыўны свет. Рэчавая дэталь дапамагала пранікнуць у сутнасць з'явы, характару, у сэнс чалавечага існавання. В. Халізеў адзначае: “Литература XX века ознаменовалась небывало широким использованием образов внешнего мира не только как атрибутов бытовой обстановки, среды обитания людей, но и (прежде всего!) как предметов, органически срощенных с внутренней жизнью человека и имеющих при этом значение символическое: и психологическое, и “бытийное”, онтологическое” [4, с. 205].

Творчасць М. Зарэцкага цікавая рамантычным спосабам мыслення, які аказаўся надзвычай прыдатным для выяўлення экзістэнцыяльнай свядомасці і быў запатрабаваны беларускай прозай у крызісныя гістарычныя перыяды грамадства XX ст. Пісьменнік, мужна ўзняўшы небяспечную для сябе тэму “былых”, “учарашніх”, пераарыентаваў увагу да жыцця ўнутранага. Невыпадкова літаратуразнаўцы (А. Макарэвіч, М. Мушынскі) пры аналізе твораў з тэматыкай “былых, учарашніх” на першы план выводзяць не сацыяльную праблематыку, а маральна-этычную. Рэвалюцыя, калектывізацыя вызвалялі з-пад кантролю тыя аспекты зла, якія ператвараліся ў метафізічнае зло, агалялі такія схаваныя чорныя глыбіні ў чалавеку, якія правакавалі хаос і катастрофы.

Рамантычны герой М. Зарэцкага пры ўсёй сваёй знешняй актыўнасці засяроджаны найперш на ўнутраным жыцці: на ўласных ваганнях, сумненнях, перажываннях. М. Зарэцкі ў неспрыяльных умовах часу адстойваў права чалавека на самастойнае спасціжэнне сябе і свету, на магчымасць выбару ў складаных, зменлівых абставінах.

Мастацкая спадчына Кузьмы Чорнага дае магчымасць правесці філасофска-метафарычнае даследаванне анталагічнай антыноміі “чалавек – чалавецтва”, трактаваць чалавека не проста як прадстаўніка сацыяльнага тыпу, а як прадстаўніка роду чалавечага. Другая сусветная вайна актуалізавала праблему выжывання ўсяго чалавецтва. Мастацкае ўвасабленне ідэі “забойства чалавека — самазабойства чалавецтва” ўвасоблена ў раманах “Пошукі будучыні”, “Млечны Шлях”. Невыпадкова герой рамана “Пошукі будучыні” стары Нявада кажа: *“Дык хто ж тады будзе жыць, калі жыццё змарнуецца? Чалавеку жыццё раз даецца”* [5, с. 110]. Вайна стварыла сітуацыю, калі не істотныя жыццё і смерць аднаго чалавека, але ад іх адзін крок да смерці калектыўнай, і тады апакаліпсіс непазбежны. Вайна для К. Чорнага і ёсць той

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

сусветны абсурд, у межах якога перспектыва самаразбурэння чалавецтва надзвычай рэальная.

Літаратурны працэс другой паловы ХХ ст. характарызуецца парабалічным характарам асэнсавання быцця і парогавай сітуацыяй як канцэптаўтваральнай. Творчасць В. Быкава, А. Адамовіча, В. Казько, І. Пташнікава, Ю. Станкевіча і іншых пісьменнікаў сведчыць, што беларуская проза ХХ ст. развівалася ў адпаведнасці з асноўнымі тэндэнцыямі сусветнага літаратурнага працэсу і прайшла як праз рэалістычныя, так і мадэрнісцкія формы ўвасаблення экзістэнцыяльнай свядомасці. Элементы авангардысцкай паэтыкі (“плынь свядомасці”, дробнасць, фрагментарнасць, паўторы, асацыяцыі, уздзеянне рытмам і гукам, апрычыннасць, прынцып люстранасці, дамінантная роля інтуітыўнага, падсвядомага, шматзначнасць паўзы, прынцып лабірынта і інш.) арганічна ўвайшлі ў беларускую прозу, чым істотна пашырылі выяўленчыя магчымасці рэалізму і паспрыялі выпрацоўцы новага тыпу філасофствавання, заснаванага на цеснай знітаванасці аб'ектыўнага і суб'ектыўнага пачаткаў у чалавеку.

Такім чынам, аналіз працэсаў укаранення экзістэнцыяльнай свядомасці ў беларускім мастацтве слова сведчыць аб шматкірункавасці  і шматвектарнасці эстэтычных пошукаў нацыянальнай прозы і падкрэслівае выразны еўропацэнтрычны характар яе асноўных тэндэнцый.


Літаратура:

1. Закс, Л. А. [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://www.dissercat.com/content/khudozhestvennoe-myshlenie-m-m-prishvina-soderzhanie-struktura-kontekst – *Дата доступа : 15.09.2011.*
2. Заманская, В.В. Экзистенциальная традиция в русской литературе ХХ века: диалоги на границах столетий : учеб. пособие для вузов : для студентов, аспирантов, преподавателей-филологов / В.В. Заманская. – М. : Флинта : Наука, 2002. – 303 с.
3. Сартр, Ж.-П. Тошнота / Ж.-П. Сартр. – СПб. : Азбука : Кн. клуб “Терра”,  1997. – 255 с.
4. Хализев, В.Е. Теория литературы : учеб. для вузов / В.Е. Хализев. – 2-е изд. – М. : Высш. шк., 2000. – 398 с.
5. Чорны, К. Збор твораў : у 8 т. / К. Чорны ; рэдкал.: В.В. Барысенка [і інш.] ; Акад. навук БССР, Ін-т літ. імя Я. Купалы. – Мінск : Маст. літ., 1972–1975. – Т. 6 : Пошукі будучыні ; Млечны Шлях ; Вялікі дзень ; Скіп'еўскі лес. – 1974. – 520 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ